# Друк за жалезнымі кратамі



**Пётр ДАРАШЧОНАК,
кандыдат філалагічных навук, дацэнт**

**Другая палова 1920-х – пачатак 1930-х гадоў увайшлі ў гісторыю Беларусі як час фарсіраванай індустрыялізацыі і гвалтоўнай калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Умацаванню адміністрацыйна-каманднай сістэмы і пераводу рэспублікі на сацыялістычныя рэйкі павінна было спрыяць стварэнне папраўчых дамоў («исправдомов»), дзе б адбывалася перавыхаванне старых буржуазных элементаў. З гэтай мэтай адкрылі адпаведныя структуры ў буйных гарадах – Мінску, Віцебску, Гомелі, Барысаве. Істотная роля ў «перакоўцы» зняволеных адводзілася газетам, якія пачалі выдавацца пры выхаваўчых аддзелах большай часткі гэтых пенітэнцыярных устаноў.**

Шматтыражка «Мысль заключенного», якая выходзіла ў 1925–1926 гадах, з'яўлялася друкаваным органам вучэбна-выхаваўчай часткі Віцебскага губдома папярэдняга зняволення. У 1924–1926 гадах там жа выдаваўся перыядычны літаратурна-мастацкі часопіс пад такой жа назвай. Яшчэ адна газета «Мысль заключенного» штомесячна выходзіла ў Гомельскім акруговым папраўча-працоўным доме ў 1927–1928 гадах. Звестак аб дзейнасці гэтых выданняў амаль не захавалася, таму фактычным матэрыялам для нашай публікацыі паслужылі нумары газеты «Творчество заключенного» за 1928 год, якія захаваліся ў фондах Нацыянальнай бібліятэкі Рэспублікі Беларусь. Увогуле газета «Творчество заключенного» выдавалася з 1926 па 1931 год як «орган учебно-воспитательной части Минисправдома». У 1926–1928 гадах выданне выходзіла на рускай мове, у нумарах за 1928 год сустракаюцца матэрыялы на беларускай мове. Абавязкі адказнага рэдактара былі ўскладзены на начальніка гэтай жа ўстановы Харытонава. Тыраж выдання вагаўся ад 120 да 200 экзэмпляраў, выпускалася газета ва ўласнай нядрэнна абсталяванай друкарні. Звестак аб яе выхадзе ў 1929–1930 гадах няма, апошні вядомы нам нумар выдання (№ 3) пабачыў свет 6 ліпеня 1931 года. У валавай нумарацыі газеты ёсць памылкі.

У першыя гады савецкай улады перад кіраўніцтвам папраўчых дамоў ставілася задача даць зняволенаму нейкую карысную прафесію, каб пасля адбыцця тэрміну пакарання ён мог уліцца ў шэрагі рабочага класа ці працоўнага сялянства. Была і другая прычына далучэння асуджаных да працы – падтрымка жыццядзейнасці пенітэнцыярных устаноў, бо папраўчыя дамы часта знаходзіліся ледзь не ў жабрацкім становішчы. Гэта стымулявала пошук шляхоў выкарыстання таннай рабочай сілы як унутры калоній, так і за іх межамі, хоць далёка не ўсе спробы дабіцца выніку мелі поспех.

Значная частка артыкула «Радио и пенитенциарная система», змешчанага на старонках газеты «Творчество заключенного» ў пачатку 1928 года, была адведзена тлумачэнню прычын стварэння папраўчых дамоў. У той час за зняволенымі яшчэ не замацаваўся ярлык «ворагаў народа». Як адзначаў аўтар публікацыі Н. Гаман, з-за неспрыяльнай сацыяльнай абстаноўкі, цяжкай спадчыны мінулага ўзнікла патрэба ў часовай ізаляцыі таго або іншага

**ПРА АЎТАРА**

ДАРАШЧОНАК Пётр Леанідавіч.

Нарадзіўся ў 1953 годзе ў в. Самсоны Сенненскага раёна Віцебскай вобласці. Скончыў факультэт журналістыкі БДУ (1979). Працаваў рэдактарам газеты «Советский медик» (Мінскі дзяржаўны медінстытут), намеснікам адказнага сакратара, в.а. загадчыка аддзела гарадской гаспадаркі «Вечернего Минска». З 1991 года – выкладчык кафедры гісторыі журналістыкі журфака БДУ. У 1996 годзе – дэкан факультэта журналістыкі БДУ, у 1997–1998 гадах працаваў кіраўніком прэс-службы Белдзяржуніверсітэта. З 1998 года – загадчык кафедры гісторыі журналістыкі факультэта журналістыкі БДУ (цяпер – Інстытут журналістыкі БДУ).

Кандыдат філалагічных навук (1993), дацэнт (1997).

Аўтар больш як 65 навуковых работ.

Сфера навуковых інтарэсаў: праблемы беларускай дзяржаўнасці ў публіцыстыцы XIX–XX стагоддзяў.

Член Беларускага саюза журналістаў.


ОТД. № 10 КОП.
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!
НОВЫЕ СОЛОВКИ
ЕЖЕНЕДЕЛЬНАЯ ГАЗЕТА.
ОРГАН СОЛОВЕЦКОЙ ЯЧЕЙКИ РКП (б.) и
УПРАВЛЕНИЯ СОЛОВЕЦКИМИ ЛАГЕРЯМИ ОСОБОГО НАЗНАЧЕНИЯ ОГПУ.
ГОД ИЗДАНИЯ 1-й
ПОДПИСНАЯ ЦЕНА НА 1925 ГОД:
на 1 месяц . . . . . — 40 к.
на 3 месяца . . . . 1 р. 20 к.
Тариф на об'явления:
1 стр. петита сзади текста 50 к.
Адрес редакции: остр. Соловки на Белом море, через Кемь, Карельской Республики.
Управл. Соловецк. Лагерями Особ. Назнач. первый этаж комн. 12. Телефон № 55.
Прием от 10 ч. до 4 ч. д. и от 8 до 10 в.
№ 23. ВОСКРЕСЕНЬЕ, 7-го ИЮНЯ 1925 года. № 23.
1923 7 июня 1925.
Начальник Управления Соллагерей ОН ОГПУ НОГТЕВ А. П.
Член Коллегии ОГПУ БОКИЙ Г. И.
Замначуправления Соллагерей ОН ОГПУ ЭЙХМАНС Ф. И.

грамадзяніна: на мэце было «ў канчатковым сэнсе яго працоўнае перавыхаванне, умацаванне кваліфікаваных навыкаў, агульнае развіццё, г. зн. наданне яму таго, што б накіравала яго жыццё па дарозе, якая б зрабіла яго, сацыяльна-нягоднага, сацыяльна-каштоўным членам грамадства» *[1]*.

«Класавая папраўчая палітыка» ў месцах зняволення мела некалькі асноўных напрамкаў – умацаванне грамадскай дысцыпліны, набыццё працоўнай кваліфікацыі, павышэнне культурна-палітычнага ўзроўню ў гуртках, школах, з дапамогай кніг, спектакляў, таварыскіх судоў і г.д. У праграмным артыкуле «Ко всем заключенным», надрукаваным у № 1 газеты «Творчество заключенного» за 1928 год, рэдакцыя звярталася да сваіх чытачоў з просьбай аб творчым супрацоўніцтве. Стварэнне на старонках выдання поўнай карціны барацьбы новага са старым, дасягненне карэнных змен у побыце, рашучая барацьба з усім, што аджыло, патрабавалі намаганняў не толькі актывістаў друку ці так званых камерных карэспандэнтаў («камкоров»). Выданне заклікала ўсіх зняволеных папраўчай установы да актыўнай стваральнай працы: «няхай наша газета будзе «могілкамі» для ўсяго пачварнага і ненармальнага на шляху да самавыпраўлення» *[2]*.

Умовы ўтрымання ў папраўчых дамах Беларусі значна адрозніваліся ад тых, якія панавалі ў буйнейшым на тэрыторыі СССР Салавецкім лагеры асобага прызначэння (СЛОН), створаным у 1923 годзе. Дарэчы, па стану на 1 кастрычніка 1927 года сярод 7445 вязняў лагера на Салаўках знаходзіліся і 502 беларусы. Менавіта салавецкі вопыт даў магчымасць кіраўніцтву АДПУ і краіны ў канцы 1920-х гадоў распрацаваць схему арганізацыі сістэмы папраўча-працоўных лагераў як асноўнага тыпу устаноў, дзе адбывалі пакаранне зняволеныя. Пастанова СНК СССР ад 11 ліпеня 1929 года «Об использовании труда уголовно-заключенных» дала пачатак стварэнню шырока разгалінаванай сеткі такіх лагераў. Выходзілі на Салаўках і перыядычныя выданні – штомесячны часопіс «СЛОН» (перайменаваны ў 1925 годзе ў «Соловецкие острова»), штодзённая газета «Новые Соловки», а з мая 1926 года быў распачаты выпуск «Материалов Соловецкого отделения Архангельского общества краеведов» (выйшла 17 зборнікаў) *[3]*.

Рэжым і ўмовы ўтрымання вязняў на Салавецкіх астравах з самага пачатку вызначала тое, што гэта месца адводзілася для строгай ізаляцыі праціўнікаў савецкай улады, «сацыяльна-небяспечнага» і «сацыяльна-шкоднага» элемента. Кантынгент зняволеных вызначаўся надзвычайнай стракатасцю – ад меншавікоў, эсэраў і белагвардзейцаў да крымінальнікаў і членаў розных бандфарміраванняў, прычым усе яны варожа ставіліся як да лагернай адміністрацыі, так і да савецкай улады ў цэлым. Не дзіўна, што там неўзабаве пачалося «закручванне гаек» і перавод усёй сістэмы на вырашэнне гаспадарчых задач (будаўніцтва чыгункі і грунтавых дарог, праца на лесанарыхтоўках і г.д.) сіламі кантынгенту асуджаных, што пастаянна павялічваўся. Паводле даных на 1 студзеня 1930 года, у салавецкіх лагерах (уключаючы Карэла-Мурманскі рэгіён) налічвалася ўжо 53 123 чалавекі.

У адрозненне ад жорсткіх метадаў Салавецкага лагера, мадэль «перакоўкі» зняволеных у папраўчых дамах на тэрыторыі БССР другой паловы 1920-х гадоў выглядала значна больш памяркоўнай і нават мела пэўныя дэмакратычныя рысы. Публікацыя «За лепшую арганізацыю працы» *[4]* была прысвечана не толькі перспектывам выхаваўчага працэсу, у аснову якога пакладзена добрасумленная праца, але і будучаму лёсу папраўчых дамоў у цэлым. Інфармацыйнай нагодай для з'яўлення гэтага матэрыяла стаў фельетон Д. Заслаўскага

«Всюду новая жизнь» на старонках газеты «Правда», у якім прагучала наступная думка: «Разбурэнне турмаў шляхам іх удасканалення здарыцца, відавочна, такім шляхам, што майстэрні і фабрыкі паступова выціснуць дом зняволення» *[4]*. На аснове гэтага тэзісу аўтар артыкула пад псеўданімам Сымон Казёл выказваў смелыя прапановы, якія б надалі папраўчым дамам статус сапраўдных вытворчых установ, дзе адсутнічаюць ахоўнікі, жалезныя краты і нават дух прымусовай працы. На яго думку, настаў час перагледзець і ранейшыя падыходы да ролі саміх майстэрняў, якія служылі толькі крыніцамі прыбытку. Не выключэннем, а нормай павінна стаць далучэнне зняволеных да вырашэння надзённых пытанняў, звязаных з паляпшэннем умоў працы, шырокі ўдзел простых работнікаў у вытворчых нарадах і г.д. Кіруючыся досведам іншых папраўчых дамоў, дзе нават адкрыліся тэхнікумы і прафшколы, аўтар лічыў патрэбным наладзіць сістэматычныя вячэрнія заняткі па павышэнні кваліфікацыі па розных спецыяльнасцях з удзелам вопытных інструктараў і майстроў *[4]*.

У артыкуле «Производственные мастерские», надрукаваным у трэцім нумары газеты за 1928 год, выказвалася можа і крамольная для таго часу, але слушная думка: «Майстэрні ўяўляюць сабой адзінкі значна большай важнасці, чым усялякія гурткі, спектаклі, кіно, газета і г.д.» *[5]*. Сапраўды, па сваіх маштабах дзейнасць «рабочай часткі» Мінскага папраўчага дома не ішла ні ў якое параўнанне з нешматлікімі мерапрыемствамі па ўмацаванні грамадскай дысцыпліны, абмежаваным колам удзельнікаў сельскагаспадарчага, драматычнага і шахматнага гурткоў, школ па ліквідацыі непісьменнасці. Нават павелічэнне да 20 чалавек колькасці актывістаў друкаванага органа вучэбна-выхаваўчай часткі і насценгазеты «Новый быт» з мэтай іх рэгулярнага выпуску разглядалася адміністрацыяй як задача далёкай будучыні.

Матэрыялы пра гаспадарчую дзейнасць папраўчага дома газета «Творчество заключенного» друкавала практычна ў кожным нумары. За перыяд з 1 кастрычніка 1926 па 1 кастрычніка 1927 года назіраўся істотны прырост рабочых месцаў для зняволеных, якія працавалі на прадпрыемствах папраўчага дома, майстэрнях, а таксама ў арганізацыях па-за межамі дазенай пенітэнцыярнай установы. Калі ў кастрычніку 1926 года ў Мінскім папраўчым доме налічвалася тры буйныя прадпрыемствы (друкарня, сталярны цэх, кравецкая майстэрня) з колькасцю 40 і болей рабочых, то праз год такіх вытворчых участкаў стала больш: адкрыліся слясарны цэх, цэх кустарнай прамысловасці, цагельны завод, пашырылі свае штаты існуючыя. Пэўны прырост работнікаў далі і дробныя структуры – шавецкая і панчошная майстэрні. У верасні 1927 года агульная колькасць працаўнікоў папраўчага дома, з улікам бясплатных работ (рамонт і абслугоўванне карпусоў, праца ў пральні, на кухні і хлебапякарні і інш.) павялічылася да 844 чалавек *[6]*.

Аб высокай зацікаўленасці зняволеных вынікамі працы асобных майстэрняў сведчаць публікацыі кіраўнікоў і работнікаў



ГОД ИЗДАНИЯ ТРЕТИЙ

# ТВОРЧЕСТВО ЗАКЛЮЧЕННОГО

ОРГАН УЧЕБНО-ВОСПИТАТЕЛЬНОЙ ЧАСТИ МИНИСПРАВДОМА

№ 1 (11) | 9 Февраля 1928 года | № 1 (11)

## Лиш труд упорный и полезный откроет нам засов железный.

### Ко всем заключенным!

[illegible]

### Радио и пенитенциарная система.

[illegible]

### Камерный культурник и для чего он?

[illegible]

Береги книгу, это ковер-самолет, который подхватит тебя на свои крылья и облетит с тобой весь мир!!

Ленин.



Пролетарии всех стран соединяйтесь!

ГОД ИЗДАНИЯ ТРЕТИЙ

ТВОРЧЕСТВО ЗАКЛЮЧЕННОГО

ОРГАН УЧЕБНО-ВОСПИТАТЕЛЬНОЙ ЧАСТИ НАРКОМЮСТА

№ 2 (22) 1 мая 1928 года № 2 (22)

Да здравствует 1-е мая — день смотра революционных сил международного пролетариата

1 Мая

Первомайское.

Як сьвяткуецца дзень 1-га мая ў Польшчы

Праз труд упарты, праз вучобу к лепшому жыццю!

гэтых структурных адзінак. Заметка «Столярный цех», змешчаная ў № 2 газеты за 1928 год, дае шмат звестак пра абсталяванне майстэрні (цыркулярка, стругальны і такарны станкі), асартымент прадукцыі («ад шыкоўнага буфета да простага кухоннага стала і табурэта»), колькасць зняволеных (26 чалавек), якія працавалі за плату *[7]*. Пэўная інфармацыя аб нялёгкіх умовах працы ёсць і ў змешчаным у гэтым жа нумары матэрыяле «Метало-ткацкий цех». Цэх, арганізаваны ў сакавіку 1928 года, павялічыў свой штат з 6 да 17 рабочых, бо спецыялізаваўся на выпуску дэфіцытнай на той час металічнай сеткі. Але набытыя адміністрацыяй станкі не мелі матораў, таму зняволеныя прыводзілі іх у рух уручную, і гэта пры сярэднім дзённым заробку ўсяго 50 капеек за змену *[8]*. Прынамсі, зарплата рабочых на цагельным заводзе, які знаходзіўся па-за межамі папраўчага дома, складала ў сярэднім 6–15 рублёў за месяц, але там яшчэ штодзень выдавалася два з паловай фунты хлеба, порцыя варанага мяса, «вполне приличный суп и каша» *[9]*.

Найбольшыя дасягненні ў арганізацыі вытворчага працэсу назіраліся ў друкарні Мінскага папраўчага дома. У публікацыі «Работа нашей типографии» падрабязна разглядалася дзейнасць друкарні і пераплётнай майстэрні за апошнія тры гады. Калі ў 1925–1926 гадах там налічвалася не больш за 10–15 работнікаў, то ў канцы 1928 года гэта структура вырасла ў самастойнае прадпрыемства, дзе былі тры друкарскія машыны, разнастайныя тэхнічныя прыстасаванні, вялікая колькасць наборных шрыфтоў. Прадпрыемства, дзе працавалі 65–70 чалавек, не толькі выконвала буйныя заказы, але і давала работнікам адпаведную кваліфікацыю, якая адкрывала для зняволеных перспектыву працаўладкавання пасля выхаду з папраўчага дома. Публікацыя таксама змяшчала цэлы шэраг крытычных заўваг наконт умоў працы: празмерна цесныя памяшканні, адсутнасць вентыляцыі, патрэбнасць рэгулярнай уборкі з-за шкоднасці свінцовага пылу, фарбаў, бензіну, газы і г.д., якія адмоўна адбіваліся на здароўі рабочых *[10]*.

У газету «Творчество заключенного» пісалі і з «філіялаў» Мінскага папраўчага дома ў ваколіцах беларускай сталіцы, дзе таксама займаліся рэалізацыяй лозунга «Лишь труд упорный и полезный откроет нам засов железный» (гэтай шапкай адкрываўся № 1 выдання за 1928 год). Сельскагаспадарчая калонія «Расьсьвет» уваходзіла ў структуру Мінскага папраўчага дома і была месцам адбыцця пакарання для сялян, якія мелі дазвол на знадворныя работы. Знаходзілася калонія за 12 км ад горада ў былым панскім маёнтку Пашкавічы. Зняволеныя (45 мужчын і 5 жанчын) вялі гаспадарку на 106 гектарах зямлі, даглядалі хатнюю жывёлу, працавалі ў майстэрнях па апрацоўцы драўніны, вырабе вазоў і малатарняў. Аўтар публікацыі адзначаў, што «селянін, працуючы там некалькі месяцаў, на практыцы праходзіць школу сельскай гаспадаркі і, вярнуўшыся дамоў, зможа палепшыць сваю хатнюю гаспадарку» *[11]*.

Атрымала асвятленне ў газеце і вытворчая дзейнасць сельскагаспадарчай калоніі «Звезда» – першай у Беларусі пенітэнцыярнай установы такога тыпу,

Беларуская Думка

створанай у 1921 годзе на месцы былога маёнтка Германсдорф у прыгарадзе Мінска. Гаспадарка мела ўсяго 2 каровы і 6 коней і спачатку зарабляла грошы варкай мармеладу, вырабам шакаладу на сахарыне і гуталіну. Новыя магчымасці з'явіліся пасля пераводу калоніі ў маёнтак Строчыца, які знаходзіўся за 15 км ад Мінска. На плошчы 126 гектараў зняволеныя не толькі арганізавалі культурную гаспадарку з 8-польным севазваротам, але і наладзілі пад кіраўніцтвам вопытнага адміністратара Чарніцкага дзейнасць каўбаснага завода, вадзяного млына, хлебапякарні, двух магазінаў, у тым ліку аднаго ў Мінску, і інш. Пры колькасці 16 вольнанаёмных і 50 зняволеных у 1928 годзе штомесячны даход калоніі складаў 40 000 рублёў *[12]*.

Працэс перавыхавання зняволеных у Мінскім папраўчым доме на аснове добрасумленнай працы дапаўняўся культурна-асветнымі мерапрыемствамі. Да маштабнай акцыі па ліквідацыі непісьменнасці, што разгарнулася ў рэспубліцы ў 1920-я гады, адміністрацыя заклікала і зняволеных. У № 2 газеты «Творчество заключенного» за 1 мая 1928 года была змешчана тэматычная старонка «Грамотность – основа культуры». Рэдакцыя выказвала заклапочанасць тым, што зняволеныя слаба цікавіліся магчымасцямі завочнай адукацыі, хаця вучэбная частка магла выпісаць для гурткоў падручнікі, стварыць спрыяльныя ўмовы для заняткаў. Пэўныя дасягненні былі на рахунку вячэрніх школ пісьменнасці (рускай і беларускай), дзе выкладчыкамі працавалі тры студэнты педагагічнага факультэта БДУ. Поспехам карысталіся заняткі і ў жаночым сельскагаспадарчым гуртку: наведванне там складала звыш 90 %. Для сялянак-«першасудніц» была падрыхтавана цікавая праграма навучання, шмат увагі надавалася агародніцтву, садаводству, жывёлагадоўлі і масларобству. Станам культурнай работы сярод зняволеных цікавіліся нават члены беларускага ўрада, у прыватнасці, газета змясціла невялікую заметку пра падарунак намесніка наркама Рабоча-сялянскай інспекцыі, старшыні ЦРК Віленстовіча, які перадаў для бібліятэкі Мінскага папраўчага дома 11 кніжак.

Відавочна, самай складанай праблемай для адміністрацыі папраўчага дома былі рэцыдывісты. На старонках газеты «Творчество заключенного» адзначалася, што распрацаваныя савецкай уладай мерапрыемствы па перавыхаванні зняволеных шляхам далучэння іх да працы, развіцця іх агульнага кругагляду, а таксама наведванне спектакляў, кіно, лекцый, заняткі ў школах, гуртках у цэлым прыносяць станоўчыя вынікі. Але, як лічыў аўтар заметкі «Товарищеские суды и их значение», «сярод асноўнай масы правапарушальнікаў сустракаюцца асобы, якія выраслі і атрымалі выхаванне ў старых турмах з іх асаблівымі традыцыямі і законамі, прайшлі праз агонь і ваду «рэцыдыву» *[13]*. Знаходзячыся ў асяроддзі выпадковых правапарушальнікаў, якія лёгка паддаваліся маральнаму ўплыву, рэцыдывісты разбэшчвалі масу зняволеных у цэлым, што прыводзіла да крадзяжоў у камерах, жорсткіх «разборак» падчас гульняў у



2 „ТВОРЧЕСТВО ЗАКЛЮЧЕННОГО" № 2

# Грамотность—основа культуры.

## Заключенные, все силы—на ликвидацию неграмотности.

### Школьная работа.

### Через учебу, через труд, мы сгладим ошибки прошлого.

карты і г.д. Дзейсным сродкам уздзеяння на тых, хто зрываў культурную працу і нявечыў камерны побыт, былі прыгаворы таварыскіх судоў, у склад якіх уваходзілі найбольш свядомыя і развітыя зняволеныя.

Пэўныя надзеі на гуманныя метады перавыхавання закаранелых злачынцаў ускладаў аўтар артыкула «О рецидивисте». Апісваючы цяжкасці, з якімі сустракаўся былы злачынец за варотамі турмы, ён сцвярджаў, што аднаго жадання стаць на сумленны шлях недастаткова: «даведка аб яго судзімасці <…> разглядаецца ва ўстановах, на прадпрыемствах, заводах і г.д. як праказа…» *[14]*. Вярнуць працаздольнага чалавека грамадству і дзяржаве маглі б спецыяльна створаныя камітэты дапамогі вызваленым з няволі. У публікацыі таксама прапаноўвалася не трымаць рэцыдывістаў у ізаляваных камерах папраўчага дома, а рассяляць іх сярод астатняй масы зняволеных для працоўнага і культурнага перавыхавання.

Вучэбна-выхаваўчая частка папраўчага дома падыходзіла да работы з закаранелымі злачынцамі куды больш прагматычна. У яе разгорнутым каментарыі да артыкула «О рецидивисте» паведамлялася, што выяўленне матываў паводзін зняволеных, якія адбывалі пакаранне па арт. 180 і 181 Крымінальнага кодэксу, даручана прафесіяналам – супрацоўнікам кабінета па вывучэнні злачыннасці пры факультэце права БДУ. Прапанова аб рассяленні ўсіх 8 рэцыдывістаў, якія сядзелі ў адной камеры, была непрымальнай як для адміністрацыі, так і для саміх зняволеных, бо гэта група сістэматычна займалася крадзяжамі нават у сценах папраўчага дома. «Браць жа іх на працу таксама немагчыма, – адзначалася ў допісе вучэбна-выхаваўчай часткі, – бо да работы яны абсалютна не прыстасаваныя і маюць да яе арганічную агіду». Канцоўка публікацыі, мякка кажучы, таксама не выклікала аптымізму: «Да гэтай групы за неаднаразовае іх знаходжанне ў папраўчым доме прымяняліся разнастайныя метады выпраўлення, але станоўчых вынікаў пакуль не бачна. Метады выпраўлення шукаюцца» *[15]*. Варта дадаць, што і сучасная пенітэнцыярная сістэма прыкладае шмат намаганняў па ізаляцыі ад грамадства рэцыдывістаў, мацёрых злачынцаў, зладзеяў у законе і г.д., але на шляху выпраўлення становяцца далёка не ўсе.

У гэтым кантэксце матэрыялы выдання 1920-х гадоў «Творчество заключенного» (Мінск) з'яўляюцца важнай дакументальнай крыніцай аб дзейнасці пенітэнцыярных установаў у першыя гады савецкай улады, асаблівасцях «класавай папраўчай палітыкі» ў перыяд нядоўгага росквіту і хуткага згортвання нэпа. Газета, якая выходзіла без ілюстрацый і фотаздымкаў, здолела, выкарыстоўваючы толькі магчымасці друкаванага слова, паказаць шматколерную карціну жыцця зняволеных, прадметна расказаць аб умовах утрымання, побыце, культурных і выхаваўчых мерапрыемствах, працоўнай дзейнасці, занятках у школах і гуртках. Лепшае з назапашанага ў тыя часы вопыту нялёгкай, поўнай драматызму барацьбы работнікаў папраўчых дамоў за перавыхаванне цёмнай, інертнай, малапісьменнай масы зняволеных, абагульненага на старонках шматтыражнай газеты, знайшло творчае прымяненне ў далейшай дзейнасці ўстаноў пенітэнцыярнай сістэмы нашай краіны, творчасці супрацоўнікаў і няштатных аўтараў шматтыражнай газеты Дэпартамента выканання пакаранняў МУС Рэспублікі Беларусь «Трудовой путь».

## ЛІТАРАТУРА

1. Гаман, Н. Радио и пенитенциарная система / Н. Гаман // Творчество заключенного. – 1928. – № 1 (11). – 9 февр.
2. Ко всем заключенным // Творчество заключенного. – 1928. – № 1 (11). – 9 февр.
3. Моруков, Ю. Соловецкий лагерь особого назначения (1923–1933 гг.) / Ю. Моруков // Альманах «Соловецкое море». – 2004. – № 3.
4. Казёл, Сымон. За лепшую арганізацыю працы / Сымон Казёл // Творчество заключенного. – 1928. – № 5 (10). – 31 дек.
5. Производственные мастерские // Творчество заключенного. – 1928. – № 3 (8). – 15 окт.
6. Голубко. Па вытворчасьці. Аб дзейнасьці рабочай часткі Менскага спраўдому ў працягу апошняга году – кастрычнік 1927 году / Голубко // Творчество заключенного. – 1928. – № 1 (11). – 9 февр.
7. Я.Г. Столярный цех / Я.Г. // Творчество заключенного. – 1928. – № 2 (22). – 1 мая.
8. Ярош, Ф. Метало-ткацкий цех / Ф. Ярош // Творчество заключенного. – 1928. – № 2 (22). – 1 мая.
9. Кирпичник. Жизнь и быт заключенных на кирпичном заводе / Кирпичник // Творчество заключенного. – 1928. – № 3 (8). – 15 окт.
10. Т. К-ч. Работа нашей типографии / Т. К-ч // Творчество заключенного. – 1928. – № 4 (9). – 7 нояб.
11. Г. С-Г. Калёнія «Расьсьвет» / Г. С-Г. // Творчество заключенного. – 1928. – № 4 (9). – 7 нояб.
12. Колония «Звезда» // Творчество заключенного. – 1928. – № 5 (10). – 31 дек.
13. Гаман. Товарищеские суды и их значение / Гаман // Творчество заключенного. – 1928. – № 1 (11). – 9 февр.
14. Рокомболь. О рецидивисте / Рокомболь // Творчество заключенного. – 1928. – № 2 (22). – 1 мая.
15. У.В.Ч. К статье «О рецидивисте» / У.В.Ч. // Творчество заключенного. – 1928. – № 2 (22). – 1 мая.